ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

**ПРАТАКОЛ**
**ІІ-га пасяджэння Выбарчай камісіі**

*2 сакавіка 2026 года*

Пасяджэнне Выбарчай камісіі распачынаецца 2 сакавіка 2026 года а 21 гадзіне 09 хвілін па мінскім часе (GMT+3). Прысутнічаюць:

*Чальцы Выбарчай камісіі –*

Алена Жылачкіна (Жываглод),
Пётр Маркелаў,
Алена Прыходзька (старшыня пасяджэння),
Дзмітрый Фурманаў.

Старшыня пасяджэння:

Пасяджэнне праводзіцца публічна праз відэаканферэнцсувязь. Ход пасяджэння фіксуецца сакратаром Камісіі ў пратаколе. Відэазапіс пасяджэння Камісіі дасяжны на платформе YouTube па адрасе: https://www.youtube.com/watch?v=EFoTMN8vlxc.

**На парадку:**

1. Вызначэнне электроннай платформы для галасавання на выбарах.
2. Вызначэнне дакументаў, праз якія выбаршчыкі змогуць ажыццяўляць права голасу.
3. Ключавыя пытанні тэхнічнага задання па функцыянаванні электроннай платформы.
4. Графік асноўных мерапрыемстваў выбарчай кампаніі.
5. Бягучы стан трохбаковага Мемарандуму.

**Алена Прыходзька:** Прывітаю ўсіх, паважанае спадарства! Сёння 2 сакавіка, 19 гадзін 9 хвілін па CET і Выбарчая камісія пачынае сваё другое адкрытае пасяджэнне. На пасяджэнні прыстнічаюць чальцы камісіі ў складзе: Алена Жылачкіна (Жываглод), Пётр Маркелаў, Алена Прыходзька, Зміцер Фурманаў. Я, Алена ПРыходзька, буду весці гэтае пасяджэнне ў якасці старшыні. Нагадаю, што пасяджэння праводзіцца публічна праз відэасувязь, ход пасяджэння фіксуецца ў адпаведным пратаколе, які на наступны дзень - то бок заўтра - мы дашлем у Каардынацыйную раду і папросім яго размясціць на афіцыйных рэсурсах каардынацыйнай рады ў адкрытым доступе. Таксама відэазапіс гэтага пасяджэння застанецца на ютуб-платформе Каардынацыйнай рады. Ну і пераходзім да абвяшчэння парадку сённяшняга пасяджэння. Першае пытанне гэта вызначэнне электроннай платформы для галасавання на выбарах. Другое пытанне гэта вызначэнне дакументаў, праз якія выбаршчыкі змогуць ажыццяўляць права голасу. Трэцяе пытанне - ключавыя пытанні тэхнічнага задання для функцыянаванні электроннай платформы. Чацвёртае - графік асноўных мерапрыемстваў выбарчай кампаніі. І пятае пытанне - бягучы стан трохбаковага Мемарандуму. Скажыце калі ласка, калегі, ці ёсць у вас нейкія пытанні ці заўвагі адносна парадку сённяшняга пасяджэння?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** няма.
**Дзмітрый Фурманаў:** Няма.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, тады пераходзім да разглядання першага пытання, гэта вызначэнне электроннай платформы для галасавання на выбарах. Выбачайце калі ласка, запусціце - у нас яшчэ

адзін член камісіі просіцца, яго не пускаюць. Хто хост - калі ласка, запусціце Яраслава… Э… Так… [смяецца] Зараз паспрабуем вырашыць. Гэта, калі ласка, калегі, скіньце ў наш працоўны чат Яраславу спасылку…

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Ты працягвай, Алена, а мы зробім.

**Алена Прыходзька:** Да-да. А я працягну адпаведна ўступнаму кароткаму слову, што тычыцца вызначэння электроннай платформы. Па-першае, што хачу адзначыць, што Камісія была сфармавана досыць нядаўна і ў нас не было досыць працяглага часу, каб праводзіць нейкія тэндары, кастынгі на тое, каб абіраць іншыя інструменты для галасавання. Па-сутнасці, мы ўсе аказаліся ў сітуацыі, калі ўжо ў нас выбар быў безальтэрнатыўны. Я зараз гэта кажу безацэначна - добра гэта ці дрэнна. Я проста канстатую сам факт, каб людзі, якія наіраюць за ходам выбарчай кампаніі бачылі, ў якіх перадвызначаных абставінах працуе Выбарчая камісія. То бок часу на іншыя разгляданні ў нас не было. Таму, тым больш, што мінулым разам платформа, якую прадаставіла каманда Паўла Лібера, зарэкамендавала сябе як вельмі дзейны і бяспечны інструмент для галасавання, ніякіх пытанняў не было да яе, таму гэтым разам мы таксама звярнуліся да каманды Паўла Лібера, каб ён прадаставіў нам і гэтым разам сваю плаформу для правядзення галасавання. Як і ў мінулы раз, галоўнымі прыярытэтамі для нас была, па-першае, бяспека - і саміх выбарчых суб’ектаў і людзей, якія будуць галасаваць. Каб платформа была бспечная, каб персанальныя даныя людзей ніякім чынам нікуды не патрапілі і ніякім чынам не былі скарыставаны інакш, чым для правядзення галасавання. І другі галоўны прыярытэт, гэта была таямніца галасавання, якая адпаведна міжнародным стандартам павінна быць забяспечана. То бок, мы можам глядзець і назіраць колькі чалавек прагаласавала, за каго, але невядома, хто гэтыя людзі. Такім чынам, зыходзячы з гэтых двух асноўных прыярытэтаў, мы праводзілі кансультацыі з Паўлам Ліберам, з камандай платформы, якая называецца Belarus ID, і абралі іх у якасці правайдара правядзення галасавання. А цяпер хачу даць слова Пятру Маркелаву, таму што Пётр у нас непасрэдна займаўся тэхнічным бокам камунікацый. Таму, я думаю, Пётр зараз патлумачыць лепш, як гэта будзе абсталявана тэхнічна. І калі ў вас6 паважаныя гледачы, ёсць пытанні, пішыце ў чат, мы будзем адсочваць і адказваць.

**Пётр Маркелаў:** я раскажу, як будзе адбывацца галасаванне. У прынцыпе яно будзе адбывацца вельмі падобным чынам, як яно і было мінулым разам. То бок карыстальнікі, якія знаходзяцца ў Беларусі, змогуць прагаласаваць толькі пры наяўнасці ВПН праз вэб-версію. Карыстальнікі, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі, змогуць прагаласаать праз прыкладанне (аплікацыю) ў сістэму Андроід ці Айос. Чаму мы, як і ў мінулыя выбары, не даем беларусам знутры краіны галасаваць праз мабільныя дадаткі - гэта выключна для бяспекі., бо не існуе дакладных спосабаў, каб схаваць усе сляды выкарыстання мабільнага дадатку ў Беларусі. З новаўвядзенняў, якія мы, прынамсі, пазначалі ў Тэхнічным заданні для правайдара, гэта тое, што дэплой будзе адбывацца на трэцяй платформе і без прамога доступу да серверу. То бок дэплой будзе адбывацца праз IPI-ключ і тэхнічна будзе адбывацца так, што ніхто не зможа мець доступа да гэтага сервера, дзе будзе разгорнута гэтае прыкладанне. Наконт захавання даных - на серверы не будуць захоўвацца аніякія персанальныя дадзеныя, акрамя коду ў зашыфраваным выглядзе, у хэш-выглядзе. Гэты шыфр, створаны праз апрацоўку ідэнтыфікацыйных дадзеных, ён неабходны для таго, каб было магчыма правесці дэдуплікацыю выбаршчыкаў, каб людзі не маглі прагаласаваць два разы. Напрыклад праз беларускі пашпарт, у тым ліку пратэрмінаваны, і пры дапамозе “пашпарту новай Беларусі”, дзе таксама ўтрымліваецца індывідуальны ідэнтыфікатар грамадзяніна, які адпавядане беларускаму пашпарту. І такім чынам гэтыя дадзеныя ў хэшаваным выглядзе будуць захоўвацца на серверы. І нават ў выпадку, калі нейкія зламыснікі атрымаюць доступ да серверу, яны не пабачаць ідэнтыфікацыйных дадзеных выбаршчыкаў, а толькі хэш. І аднавіць на базе хэшу персанальныя дадзеныя будзе немагчыма. Тут матэматычная праца, не буду тлумачыць падрабязнасці. Што тычыцца таго, каб выбаршчык мог праверыць свой голас, за каго ён аддадзены, на ляту прыкладанне будзе выдаваць гэты voting-adress, каб праз блок-чэйн сістэму выбаршчыкі маглі прагаласаваць і толькі яны пасля змогуць праверыць свой голас. Ніхто іншы, акрамя выбаршчыка, не будзе ведаць, за каго ён прагаласаваў. Гэта будзе гарантавана праз непасрэдна код сістэмы. У некаторых выпадках чальцы Камісіі разам з Правайдарам змогуць зайсці ў спрэчных выпадках у адмінку і праверыць, чаму сістэма адмовіла ў прыме голаса.

Там, падрапаны пашпарт, ці штосьці такое. Гэта будзе вельмі выключны выпадак, толькі каб наладзіць сістэму ў выпадку тэхнічных збояў. Гэтая працэдура ў нас рэгламентавана строга. У нас таксама прадугледжана многа розных мер рэагавання на выпадак несанкцыяванага доступу да сістэмы, у тым ліку аўдзіттрэйл, кожны доступ будзе запісвацца, ствараецца адпаведны лог і ўся гэтая інфармацыя будзе перадавацца Камісіі. І мы зможам праверыць, ці не адбывалася несанкцыянаванага доступу ад любых асобаў, у тым ліку і ад Правайдара.

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я трохі хвалююся, што прагучала так, быццам Камісія будзе мець доступ да персанальных дадзеных у выпадках, калі спрэчнае пытанне ёсць. Але гэта не так. можа, трохі патлумачыць, што гэта не доступ да персанальных дадзеных. Патлумач трохі.

**Пётр Маркелаў:** У выпадку, калі… ну мы ж канешне можам вырашыць, што сістэма проста адмятае тыя выпадкі, якія сістэма вызначае як чырвоныя, ці жоўтыя, дапусцім. Ну, чырвоныя сна - мы іх там дакладна адмятаем. Дапусцім, там будзе відавочны фэйк. Але будуць выпакі, ну, жоўтыя, дапусцім, дзе сістэма пазначае, што гэта можа быць нейкі падазроны выпадак. У такім выпадку мы вырашаем, што…

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Напрыклад? Напрыклад? Пётр, давай. Я таксама была на гэтым пасяджэнні, мне…

**Пётр Маркелаў:** Напрыклад браты блізняты. Фотаздымак амаль аднолькавы. Твары на сто адсоткаў супадаюць. Але гэта розныя асобы, розныя імёны і нават прозвішча можа быць розным. Вось такія выпадкі мы можам адлоўліваць. І тады Камісія зможа праверыць гэтыя дадзеныя ў лімітаваным…

**Алена Прыходзька:** У якім выглядзе, Пётр? У якім выглядзе яны змогуць іх праверыць? Таму што мінулым разам, калі мы сутыкаліся са спрэчнымі выпадкамі, то мы не мелі доступу да персанальных данных, бо яны на ўваходзе хэшаваліся. То бок ты ўсё адно маеш справу з хэшам. а мы ў спрэчных выпадках бачылі апісанне працэсу. Ну, то бок, калі істэма ідэнтыфікавала яго як нейкі спрэчны і падазроны, там было апісанне, напрыклад., выява чалавека не адпавядае ўзросту, або старонкі памяты, або не прапісана літара. То бок там была сукупнасць проста апісанняў без імёнаў, без датаў, без нічога.  Ніякіх асабістых даных, проса апісанне праблемы. Скажы калі ласка, мы зараз пра адно і тое ж кажам?

**Пётр Маркелаў:** Не зусім. Зараз мы змянем правайдара верыфікацыі. Трэба забяспечыць поўнае выдаленне ўсёй інфармацыі па сканчэнні выбараў. Для гэтага нам трэба стварыць акаўнт, мы яшчэ абмяркоўвалі, валодаць гэтым будзе фізічная або юрыдычная асоба. Гэты акаўнт, ён ужо па змоўчанні мае доступ да гэтых дадзеных. І кожны факт доступу будзе запісвацца гэтай сістэмай і бачыць факт несанкцыянаванага доступу…

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я не пагаджаюся з такім тлумачэннем. Мы не пра гэтае казалі, размаўлялі з Паўлам Ліберам падчас сустрэчы, на якой мы зафіксавалі, што ў гэтым пытанні будзе, як на мінулых выбарах. Будзе апісанне пра тое, якія ёсць памылкі, але не бачымніякіх персанальных даных. На мой погляд, зараз нейкая блытаніна. Гэта адлюстраванна ў тэхнічным заданні, што ні камісія не правайдар не маюць доступ да персанальных даных, а толькі да таго, што казала Лена - у хэшаваным выглядзе. І гэта істотна. І мы дадаткова выйдзем з публічнай камунікацыяй па гэтым пытанні, каб ніхто не быў уведзены ў зман. Каб людзі не хваляваліся за тое, што калі сістэма выдае якую-небудзь памылку, і гэта значыць, нібыта, што Выбарчая камісія мае да гэтага доступ.

**Пётр Маркелаў:** Факт у тым, што трэба стварыць намат акаўнт, каб мець доступ да сістэмы, дзе можна будзе логу адсочваць, ці не адбываецца несанкцыянаваны доступ да персанальных дадзеных. Тут проста стаяў момант, ці будзе ў нас аўтаматызаваны працэс, ну там, памяты пашпарт, гэта людзі проста не змогуць прагаласаваць. Ці мы хочам у такіх выпадках правяраць гэта ўручную і даваць да гэтага адпаведны доступ людзям, якія маюць на гэта права.

*У 19 гадзін 27 хвілін да пасяджэння далучыўся чалец Выбарчай камісіі Яраслаў Бекіш.*

**Алена Прыходзька:** Зміцер, калі ласка.

**Дзмітрый Фурманаў:** Я хацеў бы зрабіць заўвагу, што ў нас ёсць абавязкі па захоўванню ўсіх асабістых дадзеных згодна з GDPR, і таксама хачу упэўніць гледачоў, што персанальныя дадзеныя не

будуць бачныя ні нам, ні іншым асобам, і, адпаведна, не будзе вядома, за які выбарчы суб’ект чалавек прагаласаваў. Гэта вельмі важна падкрэсліць, дзякуй за ўвагу.
**Алена Прыходзька:** Алена, калі ласка.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Яшчэ раз, Пётр, мы не маем доступу да персанальных даных у памылковых ці спрэчных пытаннях. Тое, што ты сказаў, што хто-небудзь мусіць мець доступ да гэтых даных, гэта гучыць стромна. Ні мы, ні павел лібер не будзе мець доступ да даных. Будзе вырашацца аўтаматычна. Так вырашалася на мінулых выбарах, аўтаматычна вырашаліся спрэчныя пытанні. Каманда Выбарчай камісіі бачыла апісанне і якое гэта спрэчнае пытанне - памятая старонка ці яшчэ што-небудзь. Астатнім разам было так, і гэтым разам мусіць быць таксама так.
**Пётр Маркелаў:** І што мінулым разам тады Камісія рабіла? окей, яна бачыла, напрыклад, што памятая старока. Гэты чалавек не атрымаў бюлетэнь. Што далей? нічога, проста Камісія ведае, што ён атрымаў бюлетэнь і ўсё?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** А я вось была на тым жа самым сазвоне, што і ты, і атрымала адказ, што тым разам прамалі рашэнне, што окей, прымаем тыя пашпарты, дзе былі памяты старонкі.
**Пётр Маркелаў:** Ну да [смяецца]... да. Ну як мы можам? Карацей. Проста вяртаючыся да другога пытання, што… не, яшчэ раз. Тэхнічна нехта стварае акаўнт  гэтай платформе і гэта немагчыма пазбегнуць. Гэта тэхнічны момант, які не ад нас залежыць. Уявіце, вы хочаце там зрабіць дамову з кампаніяй, якая правайдар верыфікацыі. Ну як вы гэта зробіце… У сэнсе, што як мінімум гэты правайдэр верыфікацыі ён прапаноўвае ствараць акаўнт і  потым праз акаўнт можна будзе глядзець на гэтых аплікантаў. Але факт у тым, што кожны факт доступу будзе запісвацца ў лог. нельга будзе паглядзець на гэтыя даныя і не пакінуць сляды. А прымаць галасы толькі ў аўтаматычным рэжыме, гэта так. Проста тады некаторыя выбаршчыкі будуць пазбаўлены голасу праз памылкі, якія выявіць сістэма.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, калегі. Вось у нас такая адкрытая дыскусія адбываецца. І я хачу дадаць са свайго боку, пачуўшы меркаванні, якія зараз прагучалі і тыя, што гучалі раней, Камісія прытрымліваецца рашэння пра аўтаматычнае адхіленне галасоў выбаршчыкаў з хібамі ў дакументах. Не ўручную. Можа мы ў гэтым выпадку страцім некалькі спрэчных транзакцый. У мінулы раз колькасць такіх спрэчных транзакцый быў на ўзроўні статыстычнай пагрэшнасці, недзе каля 1-2 адсоткаў. Можна паглядзець па справаздачах. То бок працэнт зусім невялікі. У дадзеным выпадку якасць важнейшая за яўку. Таму дзякуй вялікі, калегі, за абмеркаванне, яшчэ раз скажу, што Алена адзначыла, працэс мусіць быць аўтыматызаваны. і зараз вы былі сведкамі таго, як адбываюцца нашыя дыскусіі і як спрэчныя моманты вырашаюцца. Скажыце калегі, ці ёсць яшчэ пытанні? Яраслаў далучыўся, дзякуй. Толькі пабачыла. Прывітанне. Нагадаю, што Яраслаў Бекіш таксама прысутнічае на пасяджэнні, спачатку я яго не аб’явіла. Скажыце калегі, у каго-небудзь ёсць яшчэ заўвагі?
**Яраслаў Бекіш:** Калі можна, там у ютубе ёсць слушныя пытанні. Як забяспечыць гарантыі таго, што ты структуры, якія валодаюць базамі дадзеных, не паўплываюць на вынікі галасавання? Нагадаю, што такія структуры як мінімум тры, у тым ліку тая структура, якая гэтыя дадзеныя спампавала ў дзяржавы. І такое пытанне, мне падаецца, яшчэ трэба абмеркаваць.
**Пётр Маркелаў:** Можа, я адкажу. Гэтая сістэма верыфікацыі, якую мы абралі, прашйла шматлікую сертыфікацыю. Менавіта таму кошт кожнай верыфікацыі даволі высокі. Каля аднаго даляра, што вельмі шмат для аўтаматычнага задання, якое займае некалькі секунд. Гэта таму што яны сапраўды вельмі вялікая кампанія, прайшлі ўсе аўдыты і гэта значыць, што толькі сапраўдныя пашпарты сапраўднага чалавека, які пакажа свой твар, пакажа свой рэальны пашпарт, ён зможа прагаласаваць. Калі ты проста ведаеш, якія ў людзей ID, гэта ніяк не дапаможа прагаласаваць, паколькі ўсё адно неабходна рабіць фатаздымак твару і суадносіць яго з фотаздымкам на сфатаграфаваным дакуменце. Штучны інтэлект правярае, ці гта сапраўдны пашпарт, ці надрукаваны на прынтары. А пра сістэму пашпарта Новай беларусі будзе адбывацца метадам двайной аўтэнтыфікацыі. Людзі, якія атрымалі пашпарт Новай Беларусі, яны атрымаюць код на мэйл, код на тэлефон, такім чынам яны пацвердзяць сваю асобу і атрымаюць бюлетэнь.
**Алена Прыходзька:** Мы ўжо проста трошкі забеглі наперад, але закранаем пытанні, якія планавалі абмяркоўваць. ФАктычна, мы ўжо і перайшлі да другога пытання пра дакументы, якімі выбаршчыкі

могуць прагаласаваць. Камісія разглядала ў тым ліку і магчымасць галасаваць праз ВНЖ замежных краін. Але па тэхнічных прычынах і праз абмежаванасць тэрмінаў Камісія прыйшла да высновы, што на гэтых выбарах не атрымаецца правесці галасаванне па ВНЖ. Магчыма прагаласаваць можна будзе па пашпарце Рэспублікі Беларусь (у тым ліку пратэрмінаваным). Падкрэслю, што юрыдычна, гэта не з'яўляецца дзейным дакументам, які дазваляе ідэнтыфікаваць асобы, і тое ж самае можна сказаць пра пашпарт Новай Беларусі. Таксама, каб пазбегнуць маніпуляцыяў і абвінавачванняў нас у палітычным заангажаванні. Адразу скажу, мы ставілі для сябе мэтай абавязкова даць магчымасць прагаласаваць тым беларусам, якія засталіся без пашпартоў, дэпартаваныя прымусова і без дакументаў. Мы вельмі хочам, каб гэтыя людзі маглі прыняць удзел у галасаванні - і як выбаршчыкі, і к, магчыма, удзельнікі выбарчага суб'екта. Таму пашпарт новай Беларусі мы абралі як адзін з інструментаў, якім людзі могуць прагаласаваць. Падкрэслю, што мы не вызначаем гэты пашпарт легітымным пасведчаннем асобы, але ў межах галасавання мы вызначаем і акцэптуем яго як інструмент для галасавання. Калегі, хто яшчэ хоча выказацца па гэтым пытанні.

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я магу толькі падтрымаць. Адзіная праблема з прыёмам іншых дакументаў, гэта, насамрэч, тэрміны. А наконт пашпарту Новай Беларусі - ва ўсіх ёсць час, каб зрабіць сабе пашпарт Новай Беларусі, каб прагаласаваць на выбарах.

**Алена Прыходзька:** Зміцер, калі ласка.

**Дзмітрый Фурманаў:** Я бы хацеў агучыць пытанне ў чаціку. Запытваюць, як быць тым, хто бег за мяжу без пашпарту?

**Алена Прыходзька:** Мы, на жаль, не можам адказваць за стваральнікаў пашпарту Новай Беларусі, ці змогуць яны забяспечыць усіх ахвочых пашпартамі ў кароткія тэрміны, але нам вядома, што яны маюць пацвярджэнні сваіх кейсаў па ідэнтыфікацыі асобаў як беларускіх грамадзянаў. Прагаласаваць двойчы з двума пашпартамі чалавек не зможа. Ці ёсць удакладненні? Калі будуць з'яўляцца пытанні ў чаце, Зміцер, звяртайце нашу ўвагу. Пераходзім да трэцяга пытання - ключавыя пытанні тэхнічнага задання па функцыянаванні электроннай платформы. Пётр, скажы калі ласка, па міжнародных стандартах чалавек, які галасуе праз электронную платформу, можа адклікаць свой голас, калі была дапушчана ім памылка пры галасаванні. Ці можам мы гэтае права чалавеку забяспечыць.

**Пётр Маркелаў:** Думаю, так, гэта магчыма. Чалавек адрымлівае свой унікальны выбарчы адрас і праз блакчэйн можа… Карацей, так, гэта магчыма.

**Алена Прыходзька:** Ці можа чалавек спраўдзіць свой голас? Што ён пайшоў туды, куды, куды выбаршчык хацеў яго накіраваць.

**Пётр Маркелаў:** Так, но так і працуе. Чалавек мае свой унікальны ідэнтыфікатар і можа праверыць свой голас праз сістэму.

**Алена Прыходзька:** Я думаю, нам яшчэ трэба гэта абмеркаваць, у які перыяд чалавек можа перагаласаваь, каб пазбегнуць усялякіх маніпуляцый. Бо, баюся, гэткім чынам мы можам скрыню Пандоры адчыніць. Ці ёсць яшчэ пытанні па тэхнічным заданні? І скажы, Пётр, на якой стадыі нашае Тэхнічнае заданне і ці ўкладаемся мы ў тэрміны, каб перадаць яго Ліберу?

**Пётр Маркелаў:** Ну вось: пасля сённяшняга пасяджэння, можа да вечара зраблю гэтыя змены, дам Камісіі паглядзець і будзе новая версія.

**Алена Прыходзька:** І абавязкова трэба, каб было адзначана, што ні Камісія, ні Правайдар не маюць дасягу да персанальных дадзеных.

**Пётр Маркелаў:** Так, гэта можна зацвердзіць фармальна. То бок, можна будзе паставіць пытанне на разгляд, ці павінна быць магчымасць ручной праверкі галасоў выбаршчыкаў ПРавадарам або Камісіяй у спрэчных сітуацыях?

**Алена Прыходзька:** Калі ласка, выказвайцеся. Зміцер, ты як лічыш?

**Дзмітрый Фурманаў:** Падтрымліваю, так.

**Алена Прыходзька:** Падтрымліваеш ідэю якую? Каб мець дасяг да персанальных даных?

**Дзмітрый Фурманаў:** Не, каб не мець, я маю на ўвазе.

**Алена Прыходзька:** Алена, калі ласка.

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Давайце пакінем гэта пытанне на ўзгаденне ўсяго тэхзадання цалкам як дакумента. Трэба, каб было дасканальна прапісана, таму я б не хацела, каб зараз за гэта ішло галасаванне.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, будзем лічыць, што устрымалася. Яраслаў?
**Яраслаў Бекіш:** Я такую ж пазіцыю займаю, як і Лена Жываглод.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, я таксама лічу, што зараз нам не трэба прымаць нейкіх канчатковых рашэнняў. Лепей скласці канчаткова тэхзаданне і прыняць рашэнне.
**Пётр Маркелаў:** Гэта прынцыповы момант, мы не зможам рухацца далей, пакуль не прымем гэтае рашэнне. Сёння гэтага, відаць, не адбудзецца, але мы павінны вызначыцца па гэтым пытанні.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй вялікі, Пётр, за слушную заўвагу, якая прывяла нас да чацвёртага пытання пасяджэння пра графік правядзення выбарчай кампаніі. Гэты графік мы ўжо склалі і ён будзе ісці як прыкладанне да трохбаковага Мемарандуму, які мы распрацоўваем разам з Каардынацыйнай радай і камандай Паўла Лібера (камандай Belarus ID). І датычна тэрмінаў, што набліжаюцца, да 5 сакавіка мы разлічваем, што мемарандум, усё ж такі, павінен быць падпісаны, а шостага сакавіка Выбарчая камісія абвесціць ужо канчатковыя сродкі правядзення шаласавання. Тэхнічнае заданне таксама павінна быць перададзена Паўлу Ліберу і ўзгоднена з ім. Наступныя некалькі дзён Выбарчая камісія прысвяціць таму, каб зафіналіць гэтыя дакументы. Наступныя даты. З 10 сакавіка адбудзецца пачатак рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў. Таму, паважаныя патэнцыйныя выбарчыя суб’екты, падавайце дакументы згодна з Палажэннем аб выбарах, якое размешчана на сайце Каардынацыйнай рады. Калі ёсць пытанні, вы можаце звяртацца з імі на нашую афіцыйную паштовую скрыню, якая размешчана на сайце Каардынацыйнай рады. Прыём дакументаў будзе адбывацца з 10 па 31 сакавіка. Калі ласка, у вас ёсць досыць часу, каб падрыхтавацца. З 1 па 3 красавіка Выбарчая камісія зацвердзіць поўны пералік зарэгістраваных суб’ектаў. З 1 па 7 красавіка будзе цягнуцца перыяд абскарджання рашэнняў Выбарчай камісіі аб рэгістрацыі або нерэгістрацы выбарчых суб’ектаў. У перыяд з 1 па 10 красавіка Камісія прыме канчатковае рашэнне аб зацвярджэнні пераліку зарэгістраваных выбарчых суб’ектаў. То бок 10 красавіка - гэта дэдлайн, калі ўжо канчаткова вырашаны ўсе пытанні, скаргі, калі такія паступяць, у будуць канчаткова высветлены ўсе ўдзельнікі выбараў. Адпаведна, ужо 11-17 траўня будзе праводзіцца галасаванне. 18 траўня будуць абвешчаны папярэднія вынікі галасавання. 19-20 будзе перыяд абскарджання папярэдніх вынікаў галасавання, а 21-23 траўня, у залежнасці ад колькасці скаргаў і іх наяўнасці, будуць абвешчаны канчатковыя вынікі выбараў. То бок 23 траўня гэта ўжо дэдлайн, калі канчаткова стане вядомы склад Каардынацыйнай рады. Калегі, ёсць пытанні, удакладненні, заўвагі?
*Каментароў не паступіла.*
**Алена Прыходзька:** Дзякуй. Пытанняў, я бачу, няма. Па сутнасці, мы ўжо разглядзелі ўсе асноўныя пытанні і прылізіліся да апошняга - бягучага стану Мемарандума. Гэтымі пытаннямі займаецца ў нас Алена Жываглод, таму калі ласка, Алена, табе слова.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Дакумент у цудоўным стане. Мы ўжо атрымалі два раўнды каментароў ад Правайдара, як мы называем каманду Паўла Лібера, атрымалі два раўнды каментароў папярэдніх ад спікера Каардынацыйнай радай. І зараз гэты дакумент разглядаецца ўпаўнаважанай на гэта Нарадай фракцый. То бок мы чакаем каментароў або узгаднення ад нарады фракцый і тады гэта будзе дакумент, які можна будзе выставіць публічна. Пазтаруся, гэта рамкавы дакумент, які размяжоўвае сферы адказнасці трох бакоў. Я лічу, што ў нас ёсць усе шансы, каб да 5 сакавіка падпісаць мемарандум згодна з графікам, які Алена анансавала.
**Алена Прыходзька:** Дадам, што гэты дакумент мы хочам зрабіць публічным, акрамя, быць можа, некаторай інфармацыі, якая можа пагражаць бяспецы выбараў. Ці ёсць пытанні ад гледачоў у чаце?
**Дзмітрый Фурманаў:** Там былі кароткія пытанні. Я, у прынцыпе, адказаў. Думаю, што можна скончваць пасяджэнне.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, Зміцер, вялікі, тады лічу, што можна завяршаць…
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** А можна? Вельмі хутка. Бо я атрымала каментары і хачу, каб людзі зразумелі, што іх пачулі. У тым ліку ад тых, хто хоча высоўваць свае кандыдатуры. Наступны наш крок пачаць прымаць выбарчыя спісы. Калі ўзнікаюць хваляванні або непаразуменні, пішыце на адрас

Камісіі. Выбарчым суб’ектам неабходна ведаць, што дадзеныя кандыдатаў, іх імёны і прозвішчы, будуць апублікаваны, згодна з працэдурай, па якой працуе Выбарчая Камісія і якая прадугледжана паажэннем аб выбарах, прынятым Каардынацынай радай. У выпадку ўзнікнення неабходнасці ўнасеці дадатковае рэгуляванне выбарчага працэсу, Камісія паведаміць пра гэта неадкладна і давядзе інфармацыю праз афіцыйныя рэсурсы.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, Алена. Я таксама дадам, што мы будзем узаемадзейнічаць з Каардынацыйнай радай, каб скласці дадатковыя чэк-лісты і іншую інфармацыю, неабходную для ўдзелу ў выбарах. У тым ліку патрабаванні па гендарных квотах. Я мяркую, бліжэйшым часам мы складзем гэтыя гайды з Каардынацыйнай радай. Па ўсіх пытаннях пішыце на пошту Каардынацыйнай рады. Калегі, ці ёсць што дадаць па сённяшнім пасяджэнні?
*Каментароў не паступіла.*
**Алена Прыходзька:** калі не, то дзякуй вялікі, будзем заканчваць. Як я ўжо казала, відэазапіс гэтага пасяджэння будзе дасяжны на ютуб-канале Каардынацыйнай рады, а пратакол гэтага пасяджэння ў друкаваным выглядзе будзе дасланы Каардынацыйнай радзе і апублікаваны на яе рэсурсах. Ну а я дзякую маім калегам, дзякую гледачам, людзям, якія цікавяцца і дасылаюць пытанні. І дзякую ўсім будучым выбарчым суб’ектам за вашую смеласць, рашучасць. Калі ласка, мы вас чакаем і спадзяемся, што вас будзе многа, вы будзеце рознымі і кожны знойдзе сваё месца ў новым складзе Каардынацыйнай рады. Жыве Беларусь!
**Дзмітрый Фурманаў:** Жыве!
**Пётр Маркелаў:** Жыве!
**Дзмітрый Фурманаў:** Дзякуй.
**Алена Прыходзька:** Пакуль, дзякуй.
**Пётр Маркелаў:** Усім добрага вечару.

Пасяджэнне Выбарчай камісіі завершана ў 22 гадзіны 02 хвіліны па мінскім часе (GMT+3)

**Старшыня Выбарчай камісіі**  **Алена Прыходзька**